№ 43 (396)
Лістапад 2011 года

# Краязнаўчая газета

Выдаецца з красавіка 2003 года
www.bfk.by

## У нумары:

☞ Спадчына: *гісторыю неабходна цікава «падаваць» –* *стар. 2*

☞ Наша гісторыя: *мясціны Т. Рэйтана на фота Я. Булгака –* *стар. 4*

☞ Рэгіён: *паеду зноў у Чырвоны Рог –* *стар. 6*

*Фота Сяргея ЧАРАНОВІЧА*

# Краязнаўчыя чытанні

***Сёлета 10–11 лістапада ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі адбыліся VII Міжнародныя кнігазнаўчыя чытанні «Бібліятэкі і палітыка адкрытага доступу да інфармацыі і ведаў».***

Арганізатарамі мерапрыемства выступілі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, Бібліятэчная Асамблея Еўразіі, Беларуская бібліятэчная асацыяцыя, Нацыянальная бібліятэка Беларусі, Нацыянальны гісторыка-культурны музей-запаведнік «Нясвіж».

У працы канферэнцыі прынялі ўдзел звыш 300 дэлегатаў з Беларусі, Расіі, Украіны, Літвы, Швейцарыі: вядучыя спецыялісты бібліятэк, музеяў, выдавецтваў, адукацыйных і навукова-даследчых установаў, грамадскіх арганізацыяў, прадстаўнікі заканадаўчай сферы і выканаўчых уладаў, вытворцы праграмнага забеспячэння, тэхнічных сродкаў і інфармацыйнай прадукцыі.

На пленарным і секцыйным пасяджэннях былі акрэсленыя шляхі ўдасканалення заканадаўчай базы і сістэмы дзяржаўнага рэгулявання ў галіне адкрытага доступу да інфармацыі і ведаў, абароны правоў інтэлектуальнай уласнасці, стварэння электронных бібліятэк і архіваў, навуковага і кадравага забеспячэння інавацыйнага развіцця інфармацыйных установаў.

Вынікі працы VII Міжнародных кнігазнаўчых чытанняў і прынятыя рашэнні паспрыяюць развіццю свабоднага і раўнапраўнага доступу да інфармацыі і ведаў, стануцца значным унёскам далейшага інтэлектуальнага росквіту грамадства.

***Паводле інфармацыі арганізатараў***

## На тым тыдні...

✓ **3 і 4 лістапада** ў Дзяржаўным літаратурна-мемарыяльным музеі Якуба Коласа адбылося літаратурнае свята **«Каласавіны»**, прысвечанае 129-годдзю з дня нараджэння народнага паэта Беларусі Якуба Коласа. У рамках яго прайшло літаратурнае мерапрыемства для дзяцей «Казкі жыцця» з удзелам фальклорнага калектыву д/с № 266 г. Мінска, адкрылася выстаўка «Рукою Коласа» і прэзентацыя 13–15 тамоў Збору твораў Якуба Коласа ў 20-і тамах. У імпрэзе ўдзельнічалі член-карэспандэнт НАН Беларусі, прафесар, доктар філалагічных навук Міхась Мушынскі, навуковы супрацоўнік Інстытута мовы і літаратуры імя Якуба Коласа і Янкі Купалы НАН Беларусі, галоўны рэдактар выдавецтва «Беларуская навука» Генадзь Кісялёў, галоўны рэдактар выдавецтва «Мастацкая літаратура» Віктар Шніп, намеснік старшыні ГА «Беларускі фонд культуры» Анатоль Бутэвіч, члены рэдкалегіі выдання, родныя Якуба Коласа.

✓ **8 лістапада** ў Нацыянальным гістарычным музеі Рэспублікі Беларусь адкрылася **выстаўка вышытых карцінаў «Чароўны свет»** клуба «Сузор'е». Працы адкрываюць прыгажосць сучаснай вышыўкі, розныя тэхнікі – крыжык, паўкрыжык, габеленавы шоў, ручная гладзь, машынная мастацкая гладзь. На выстаўцы прадстаўленыя палотны з матывамі прыроды, жаночых і дзіцячых вобразаў.

✓ **9 лістапада** ў Палацы мастацтва адбылося адкрыццё трох мастацкіх выставак Беларускага саюза мастакоў **«Прастора і форма»**, на якой можна пабачыць працы майстроў керамікі, шкла, габелена, створаныя за апошнія два гады вы-пускнікамі кафедры дэкаратыўна-ўжытковага мастацтва Беларускай акадэміі мастацтва, якой сёлета спаўняецца 50 гадоў.

Юбілейная мастацкая выстаўка Аляксея Марачкіна называецца **«Логіка руберойду»**. У сваіх палотнах юбіляр (творчы псеўданім Алесь Мага) не абмінае вострыя вуглы нашага існавання. Выстаўка мае рэтраспектыўны характар.

Трэцяя – **«Рэтраспекцыя плаката»**. Беларускі плакат, як і іншыя жанры выяўленчага мастацтва, мае свае асаблівасці і традыцыі гістарычнага развіцця. У розныя часы яго тэматыка была самая разнастайная: палітычная, сацыяльная, культурна-відовішчная і рэкламная. Беларускі плакат удзельнічаў і ўдзельнічае ў нацыянальных і міжнародных конкурсах, неаднаразова перамагаў на конкурсах у Польшчы, Фінляндыі, Балгарыі, Расіі, ЗША, Японіі, ва Украіне і інш.

Усе выстаўкі можна наведаць да 20 лістапада.

✓ У Дзяржаўным літаратурным музеі Янкі Купалы працуе **дакументальна-мастацкая выстаўка, прымеркаваная да 90-годдзя вершаванага перакладу Янкам Купалам паэмы «Слова пра паход Ігаравы»**. Дарэчы, пры жыцці пісьменніка толькі аднойчы, у 1938 г., ён выдаваўся асобнай кнігай. Першая частка выстаўкі – мастацкая: графічныя ілюстрацыі 1984 г., створаныя да кнігі перакладаў «Слова...» народным мастаком Беларусі Георгіем Паплаўскім і мастачкай Аленай Лось. Другая – купалаўскія рукапісы перакладу «Слова...», кнігі з публікацыяй паэмы на рускай мове, а таксама адзінае асобнае выданне перакладу 1938 г.

✓ **11 лістапада** ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі адкрылася **юбілейная выстаўка «У віры імклівага жыцця»**, прысвечаная 110-годдзю з дня нараджэння Міхася Зарэцкага. Творчая спадчына пісьменніка багатая і жанрава шматстайная. Гэта некалькі зборнікаў апавяданняў, раманы «Сцежкі-дарожкі» і «Вязьмо», п'есы, нарысы, крытычныя артыкулы, пераклады. Прадстаўленыя кнігі дэманструюць шырокі творчы дыяпазон пісьменніка. Размешчаныя ў экспазіцыі навуковыя працы вядомых літаратура- і мовазнаўцаў сведчаць, што мастацкая спадчына Міхася Зарэцкага і сёння выклікае вялікую цікавасць даследчыкаў.

У **той самы дзень** у НББ адкрылася і **кніжная выстаўка «Сугучча думкі і пачуцця»**, прымеркаваная да 80-годдзя паэта, драматурга, публіцыста, крытыка, перакладчыка Анатоля Вярцінскага. Паэтычная творчасць юбіляра прадстаўленая ў раздзеле «Споведзь даверлівая і шчырая». Празаічныя творы літаратара дэманструюцца ў раздзеле «Светла. Смела. Магутна», дзе змешчаныя яго п'есы, публіцыстыка, літаратурная крытыка, артыкулы ды інш. Заключная частка экспазіцыі – «Высокае неба яго ідэала» падагульняе звесткі пра А. Вярцінскага як неардынарнага і цікавага чалавека, знакамітага паэта і празаіка, дзяржаўнага і грамадскага дзеяча.

Абедзве выстаўкі працуюць да 6 снежня.

З бібліятэкі «КГ»

# Гісторыя – прадмет не нудны і сухі, або Пра Мір – захапляльна

Прайшоў амаль год, як афіцыйна расчыніў дзверы наведнікам музейны комплекс «Мірскі замак». Аднак за гэты час тыя, хто знаёміцца з экспазіцыяй замка, так і не атрымалі хаця б якога сціплага буклета, саматужнай даведкі-памяткі аб гісторыі гэтага ўнікальнага збудавання, яго рэстаўрацыі, выніках музеефікацыі. Калі гэты замкавы аб'ект, узяты пад ахову самім ЮНЕСКА, так разгортвае працу па абслугоўванні турыстаў, то што казаць пра іншыя помнікі, да якіх ужо пратаптаныя сцежкі, але інфармацыі аб іх турыстычнай, мастацкай каштоўнасці няма ніякай. Вынікае: «клопаты» дзяржавы аб наданні нашай краіне іміджу турыстычнай – марныя.

Яны і сапраўды былі б марныя, каб не зацікаўленыя асобы, якія лечаць гэтую «дзяржаўную хваробу», такія людзі, людзі як Анатоль Бутэвіч. На вастрыё яго пісьменніцкага, даследчыцкага пяра трапляюць значныя гістарычныя тэмы, аб'екты, да якіх не даходзяць рукі іншых.

Вось літаральна на днях пабачыла свет яго чарговая кніга «Таямніцы Мірскага замка» з падзагалоўкам «Падарожжа па сівых мурах з Адамам Міцкевічам». Не, не імкнуўся Анатоль Іванавіч сваёю кнігаю падмяніць працу музейных работнікаў і гісторыкаў па стварэнні дапаможнікаў, буклетаў, каталогаў, даведнікаў па Мірскім замку – гэта не ўваходзіць у задачу, якую ён перад сабою паставіў. Яго імкненне было ў іншым: раскрыць вочы невідушчым, зацікавіць і прыспешыць іх, як ён кажа, «зазірнуць за намітку гісторыі, каб убачыць, што і як адбываецца, пазнаёміцца з выбітнымі асобамі беларускай даўніны». І сапраўды, на прыкладзе Мірскага замка А. Бутэвіч дае столькі цікавай захапляльнай інфармацыі (у першую чаргу для моладзі), грунтаванай на таямніцах, легендах, невядомых гістарычных фактах, што мімаволі пачынаеш усё гэта параўноўваць з фактычным, але сухім і сумным, матэрыялам беларускіх школьных падручнікаў гісторыі. Параўноўваючы, разумееш, як і чаму не любяць найбагатую гісторыю і культуру краіны нашыя дзеці. Не любяць таму, што такіх улюбёных у свой край людзей, як А. Бутэвіч, у нас засталося вельмі мала. Падручнікі складаюць, відаць, афіцыйныя асобы, для афіцыйнага чытання, без душэўнага ўспрымання, без глыбіннага разумення многіх гістарычных фактаў.




Успамінаецца мая сустрэча з настаўніцай гісторыі адной са школ нашай беларускай глыбінкі. На маё пытанне, чаму ў школе не выпісваюць «Краязнаўчую газету», яна адказала прыкладна так: «Нам забаронена зверху даваць вучням матэрыял па-за межамі праграмы – звыш таго, што напісана ў падручніку». Вынікае: тое, чым плённа займаюцца краязнаўчыя аддзелы бібліятэк, многія грамадскія арганізацыі, нарэшце, вялікі актыў «Краязнаўчай газеты», такія неўрымслівыя, адданыя Бацькаўшчыне людзі, як А. Бутэвіч, не патрэбныя школе? Можа, і не паўсюль так адбываецца, як сказала тая настаўніца гісторыі, але мне становіцца страшна менавіта за яе вучняў, якія нічога не будуць ведаць пра свой край, пра сваю Айчыну, бо сам падручнік не болей як пералік сухіх датаў, падзеяў, асобаў.

Не буду апісваць змест кнігі А. Бутэвіча падрабязна, яе трэба купіць і чытаць. Купіць, таму што яе кошт будзе не намнога большы, чым білет на экскурсію па Мірскім замку, а чытаць – таму што лепей адзін раз прачытаць, і тым упэўніцца ў сказаным, чым даведацца пра гэта ад іншых.

Вось назвы некаторых раздзелаў кнігі: «Як і калі Мір стаў называцца Мірам», «Уладальнікі Міра і замка», «Адметнасці замка», «Мір – цыганская сталіца», «Бітва каля Мірскага замка», «Легенды Мірскага замка» і інш.

Усё гэта на 122 старонках багата ілюстраванага гістарычнымі здымкамі, малюнкамі, дакументамі выдання. Выдадзеная кніга ў выдавецтве «Літаратура і Мастацтва» накладам 1 100 асобнікаў, суправаджаецца каментарамі на рускай і англійскай мовах.

«Таямніцы Мірскага замка» чакаюць кожнага, хто наведае гэта гістарычнае мястэчка і захоча больш падрабязна пазнаёміцца з яго адметнасцямі.

*Уладзімір ГІЛЕП*

Падпісацца на «Краязнаўчую газету» можна ў кожным паштовым аддзяленні краіны

| Індывідуальная падпіска | Індэкс 63320 |
|---|---|
| 1 месяц | 9 740 руб. |
| 3 месяцы | 29 220 руб. |
| 6 месяцаў | 58 440 руб. |

| Ведамасная падпіска | Індэкс 633202 |
|---|---|
| 1 месяц | 9 983 руб. |
| 3 месяцы | 29 949 руб. |
| 6 месяцаў | 59 898 руб. |

Міністэрства сувязі Рэспублікі Беларусь

Ф.СП-1

АБАНЕМЕНТ *на газету* 63320 (індэкс выдання)

Краязнаўчая газета

Колькасць камплектаў

на 20 _ год па месяцах

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | 12 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | | | | | | |

Куды (паштовы індэкс) (адрас)

Каму (прозвішча, ініцыялы)

ДАСТАВАЧНАЯ КАРТКА на газету 63320 (індэкс выдання)

ПВ | месца | літар

Краязнаўчая газета

Кошт: падпіскі _____руб.; пераадрасоўкі _____руб.; Колькасць камплектаў

на 20 _ год па месяцах

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | 12 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | | | | | | |

Куды (паштовы індэкс) (адрас)

Каму (прозвішча, ініцыялы)

Нам пра нас

**Марына МАРКЕВІЧ,**
**магістрант філалагічнага факультэта ГДУ імя Ф. Скарыны**

Памятаю, яшчэ ў школе, калі нашая свядомасць знаходзілася на стадыі станаўлення, намеснік дырэктара па выхаваўчай працы, яна ж і настаўнік хіміі, Таццяна Іванаўна Сілкова ўсё казала нам звяртацца да «Краязнаўчай газеты». Маўляў, там – выток любові да роднай зямлі, да роднай хаты, да роднага кутка. Ды куды там! Мы – тыя яшчэ сарвігаловы – і блізка нават не ўсведамлялі ўсю важкасць і вартасць слова *Радзіма*, таму і наведваць чытальныя залы бібліятэк не заўсёды лічылі патрэбным.

Час ішоў. І з узростам прыходзіла думка, што да ўсякай літаратуры, не, нават – ЛІТАРЫ, трэба дарасці: пакуль асоба ўнутры не створыць патрэбную атмасферу для ўспрыняцця таго або іншага матэрыялу, не прымусіш яе гэты матэрыял успрыняць. Вось і атрымліваецца, што лёгка ўспрымальны тэкст анекдота не паставіш нароўні з філасофскімі трактатамі Ніцшэ. А літаратура пра Бацькаўшчыну займае сярод створаных чалавецтвам тэкстаў адно з пачэсных месцаў.

Дарасла да ўспрыняцця літаратуры краязнаўчай і мая асоба. Судакрануўшыся з «Краязнаўчай газетай», я была здзіўленая калейдаскапічнасцю прадстаўленых на старонках матэрыялаў і ахопам тэмаў. Чаму, запытаецеся? Адкажу наступным чынам. Не чужым – сваім – адчуваеш сябе, калі гартаеш газету. Матэрыялы, пачынаючы з замалёвак пра мясцовыя асаблівасці ці то мовы, ці то ўласна побыту таго або іншага рэгіёну, і заканчваючы нарысамі па гісторыі Айчыны, здзіўляюць сваім каларытам. Не забывае газета павіншаваць і юбіляраў. Знаходзіцца месца на яе старонках і для асвятлення культурных падзеяў, што адбываюцца ў краіне. Не грэбуе выданне і мастацкімі нататкамі.

Акрамя таго «Краязнаўчая газета» дае моладзі, неабыякавай да гісторыі, культуры і ўвогуле жыцця свайго краю, прастор для развіцця патэнцыялу. Але гэта, бадай, не самае галоўнае. Мова выдання – беларуская. Аўтары допісаў свядома абіраюць беларускую мову для сваіх матэрыялаў, каб публікавацца на старонках выдання. А як жа інакш? Мова беларускага краю – беларуская. Таму і даследуем край свой менавіта на ёй, на роднай беларускай мове. Як пісаў пра жыццядайную моц мовы Анатоль Сыс:

*Піць яе – не наталіцца*
*над пуцінай млечнай:*
*лета – золак – шчамяліца…*
*Маці – мова – вечнасць…*

Вялікі дзякуй усім сябрам рэдкалегіі за стварэнне такога шэдэўра – свайго роду трывалага падмурка для станаўлення самасвядомасці. Асобны дзякуй галоўнаму рэдактару выдання Уладзіміру Гілепу. Трымайцеся моцна!

**P.S.** Газету я хацела б назваць «кландайк беларушчыны». Хіба не так?

# «Лістапад» ад польскага танга да кібертэхналогіяў

***На мінулым тыдні завяршыўся XVIII Мінскі міжнародны кінафестываль «Лістапад 2011». З кожным годам кола яго ўдзельнікаў і гледачоў пашыраецца. Сёлета ў Мінск прывезлі больш за 150 фільмаў з 38 краінаў свету. Як адзначыў на цырымоніі закрыцця «Лістапада» старшыня Мінгарвыканкама Мікалай Ладуцька, фестывальныя фільмы пабачылі каля 40 тысячаў чалавек. На працягу сямі дзён наведнікі «Лістапада» глядзелі вялікае кіно на мове арыгінала «з шырока адкрытымі вачыма».***

*Майстар-клас Ежы Сляпкоўскага*

Адметнасцю сёлетняга фестывалю стала яго пашырэнне за межы кінамастацтва і выхад на тэатральныя сцэны Дзяржаўнага акадэмічнага музычнага тэатра (дзе Веніямін Смехаў і ягоная дачка Аліка прэзентавалі танцавальна-паэтычную кампазіцыю «Дванаццаць месяцаў танга») і Палаца спорту (у якім польскія майстры перформансу з познанскага тэатра паказалі авангардна-фантастычнае шоу паводле твораў Станіслава Лема «Планета Лем»).

*Д. Рашкоўска (справа) уручае дыплом Е. Махавай*

У праекце Веніяміна Смехава ўпершыню бацька і дачка выступілі на сцэне як партнёры. В. Смехаў спалучыў свае тэксты, напісаныя да знакамітых польскіх танга 1930-х гадоў, з паэзіяй срэбнага веку. Атрымалася насычаная і дынамічная праграма, дзе сустракаюцца музыка танга ў выкананні Tango Orquesta і энергія верша. Сучасны відэаарт стварае паралельны сюжэт старым тэкстам і мелодыям. У кожнага сезона свой колер і ўбор. На акцёрцы вінтажныя сукенкі 1930–1950-х гадоў, што ўзмацняе пачуццё лёгкай настальгіі, уласцівую гэтаму шоу.

Перформанс «Планета Лем» стаў сапраўдным падарункам аматарам фантастыкі Станіслава Лема і цудоўна завяршыў святкаванні ў Беларусі юбілею слыннага паляка, пра які ўжо распавядала «КГ». Імпрэза арганізаваная ў рамках праграмы культурных мерапрыемстваў старшынства Польшчы ў Савеце Еўропы «I, culture». Спектакль уяўляе сабой высокатэхналагічнае дзейства з мноствам спецэфектаў. Героі «Планеты Лем» – гэта людзі, гуманоіды, робаты, суперкамп'ютары, якія жывуць побач і спрабуюць зразумець адно аднаго, каб мірна суіснаваць. У сюжэт спектакля ўвайшлі сцэны прароцкіх прадказанняў Лема пра стварэнне віртуальнай рэальнасці, штучнага інтэлекту і новага свету, які жыве паводле законаў кібертэхналогіяў.

Праграма фестывалю акрамя конкурсных і пазаконкурсных праграмаў «Лістапада 2011» і «Лістападзіка» ў 19-і намінацыях уключала майстар-класы рэжысёраў і прадзюсараў, дыскусіі, канферэнцыі на тэму дакументальнага кіно, анімацыйную праграму «Беларусьфільма» з удзелам мастакоў-аніматараў, праграму беларускага дакументальнага кіно, прэзентацыю Міжнароднага фестывалю кароткаметражнага кіно «Сто» (дэманстраваліся фільмы з Ірана), спектакль-кінаканцэрт «Феерыя Жоржа Мельеса» (Францыя) і шмат іншага. Да ўрачыстага адкрыцця «Лістапада» вядомым мастацтвазнаўцам Ларысай Фінкельштэйн у фае Палаца Рэспублікі была падрыхтаваная выстаўка сучаснай скульптуры дзевяці маладых творцаў.

*Л. Філкельштэйн і яе выстаўка*

*В. і А. Смехавы перад адкрыццём фестывалю*

*Прэзентацыя фільма Крысціяна Матысека (у цэнтры)*

Значнай падзеяй не толькі для фестывалю, але і ўвогуле для развіцця кінамастацтва ў Беларусі стала правядзенне ў Мінску школы міжнароднай дакументалістыкі «Драган форум» (Польшча). Гэта вядомы і аўтарытэтны клуб, што аб'ядноўвае дакументалістаў розных краінаў. Цікава, што названы ён у гонар шырока вядомага ў Кракаве Цмока, які ахоўвае Вавельскі замак. За пяць гадоў існавання форума арганізатарамі створаная шырокая сетка кантактаў у асяроддзі адмыслоўцаў у галіне кінаіндустрыі, а таксама распрацаваны механізм дапамогі маладым кінарэжысёрам у рэалізацыі іх творчых планаў. Выкладчыкі «Драган форума» – вядомыя эксперты: Яцэк Блавут, Марцэль Лазінскі, Павел Пітэра, Марыя Змарж-Качановіч і Дарота Рашкоўска з Польшчы, Хэйна Дэкерт і Ханс-Роберт Эйзенхауэр з ФРГ, Стывен Сейдэнберг з Вялікабрытаніі, Ежы Шлядкоўскі са Швецыі ды іншыя.

«Драган форум» спрыяў з'яўленню фільмаў «Гуара» (рэж. Анджэй Дыбчак, Яцак Наглоўскі PL/ UK, 2008), «Рабінзоны з Мантысаары» (рэж. Віктар Аслюк DE/BY, 2008), «Крузенштэрн» (рэж. Мачэй Куске PL/FR/FIN 2009), «Трус а-ля Берлін» (рэж. Бартэк Канопка, DE/PL/BE/FIN), «Мама памерла ў суботу на кухні...» (рэж. Максім Васяновіч UA/FIN/SV 2010), «Эфект Шапэна» (рэж. Кшыштаф Джанчалоўскі, PL 2010), «Тэмерсон & Тэмерсон» (рэж. Вікторыя Шыманска, FR/UK/PL) ды інш.

У рамках мінскай сесіі міжнароднай навучальнай праграмы ў галіне стварэння і прасоўвання дакументальных фільмаў найлепшыя польскія рэжысёры, сцэнарысты і прадзюсары правялі майстар-класы для аўтараў-пачаткоўцаў, а таксама сустрэчы і канферэнцыі з удзелам вядучых польскіх дакументалістаў. Адбыліся паказы найлепшых дакументальных фільмаў апошніх гадоў.

Адкрыў праграму кінапаказаў «Драган форума» фільм беларускіх аўтараў Віктара Аслюка і Вольгі Дашук «Рабінзоны з Мантысаары» пра стасункі двух апошніх жыхароў астравоў на Ладажскім возеры – 70-гадовага беларуса і 86-гадовага фіна. Гісторыя пачынаецца ў 1952 годзе, калі паводле загада Сталіна дзеля каланізацыі былых фінскіх тэрыторыяў тут пасялілі 36 беларускіх сем'яў. Дэманстраваліся таксама іншыя цікавыя фільмы, сярод якіх «Дзюбай і кіпцюром» Крысціяна Матысека пра птушак Белавежскай пушчы, які заваяваў сорак узнагародаў на міжнародных фэстах.

А ў конкурснай праграме дакументальнага кіно ўдзельнічалі 17 стужак з 13 краінаў. Але падрабязней аб гэтым паказе ды іншых цікавых мерапрыемствах «Лістапада» распавядзем у наступным нумары.

***Наталі КУПРЭВІЧ,***
***фота аўтара***

# Фотаздымак як сведка гісторыі

***Нам вядома шмат пісьменнікаў, мастакоў, архітэктараў, якія жылі ў XIX стагоддзі. Пра беларускіх фатографаў гэтага ж часу мы ведаем значна менш.***

Наўрад ці можна знайсці беларускага майстра фотаздымку накшталт Яна Булгака. Яго фотаадбіткі нельга зблытаць – індывідуальнасць і асаблівы характар аўтара вылучаюць іх з працаў іншых фатографаў. Таму яго творчыя і жыццёвыя шляхі ўсё часцей зацікаўліваюць сучаснікаў.

Здольнасці Яна Булгака не абмяжоўваліся стварэннем фотакартак, яшчэ ён пісаў кнігі і вершы. Яго аўтабіяграфічная кніга «Край дзіцячых гадоў» напісаная такою жывой і сакавітай мовай, што пейзажы, як жывыя, паўстаюць з друкаваных старонак, а характары людзей, перададзеныя з тонкім майстэрствам, прымушаюць пранікнуцца сімпатыяй да іх. Карацей кажучы, за якую творчую працу не браўся б Булгак – усё атрымлівалася ладна і прыгожа. Мусіць, таму, што ў кожную справу была ўкладзеная часцінка асабістага сэрца і многа любові.

Акрамя творчасці фатограф цікавіўся гісторыяй. Ян Булгак пабываў у многіх сядзібах Навагрудчыны. У свой час ён наведваў і вёску Грушаўка – радавы маёнтак Рэйтанаў, аб гэтым сведчаць зробленыя ім фотаздымкі сядзібы. Чым зацікавіла фатографа Грушаўка? Магчыма, гістарычным мінулым і асабліва трагічным лёсам Тадэвуша Рэйтана. Жыццё і палітычная дзейнасць гэтага чалавека добра вядомыя аматарам беларускай гісторыі. Але і па сённяшні дзень тут ёсць свае «белыя плямы», невывучаныя таямніцы. Грушаўскія фотаздымкі Булгака нагодаю для размовы з мясцовым краязнаўцам, мастаком і фатографам Сяргеем Чарановічам. На здымках можна бачыць экстэр'ер і інтэр'ер «мураванкі», у якой прайшлі апошнія гады жыцця Т. Рэйтана і ў якой трагічна абарвалася яго жыццё. Паводле канструкцыі гэта тыповы дом нямецкага бюргера, такія ж дамы можна пабачыць у Германіі: у плане дом падзелены на дзве часткі, крыжападобнае звядзенне столі, тоўстыя сцены, у якіх у выглядзе глыбокіх нішаў былі зробленыя кніжныя паліцы. Магчыма, Рэйтаны, выхадцы з Германіі, узвялі гэты будынак на ўспамін пра зямлю свайго паходжання. У гэтым доме зберагаўся сямейны архіў роду, частка бібліятэкі, найбольш каштоўныя рэчы.

*Члены камітэта, створанага да 150-годдзя з дня смерці Тадэвуша Рэйтана*

Сяргей Вячаслававіч расказаў аб сваёй версіі падзеяў, звязаных з апошнімі днямі жыцця і смерці Тадэвуша Рэйтана. Краязнаўца паказаў мне некалькі фотаздымкаў Грушаўкі, зробленых у 1930-я гады ў сядзібе Рэйтанаў. Асаблівую ўвагу прыцягнулі два, на якіх адлюстраваныя члены камітэта, створанага да 150-годдзя з дня смерці Тадэвуша Рэйтана, над месцам яго таемнага пахавання і памятная дошка з выяваю Т. Рэйтана (гэтая дошка была ўмураваная ў сцяну злева ад алтара ў капліцы-пахавальні роду Рэйтанаў у Грушаўцы). Асобую цікавасць, як мяркуе Сяргей Вячаслававіч, выклікае надпіс, які сярод іншых зроблены на гэтай дошцы: «...Месца спачынку невядома». Чаму ж месца пахавання падаецца як невядомае?

Тадэвуш Рэйтан скончыў жыццё самагубствам у «мураванцы», якая стаіць побач з домам Грушаўскай сядзібы. Куды ж пасля смерці знік нябожчык? Як гэта магло стацца? Справа ў тым, што крэўныя Т. Рэйтана пахавалі яго ў патаемным месцы, якое прыгадваецца ў гістарычнай літаратуры як «месца пад грабам» і знаходзіцца на тэрыторыі парку Грушаўскай сядзібы. Магчыма, гэта было зроблена для таго, каб да магілы Тадэвуша не маглі прыходзіць на паклон патрыёты Рэчы Паспалітай, бо ў такім разе лёс гаспадароў Грушаўкі быў бы пад пагрозай з-за пераследу расійскіх уладаў. Секвестр маёнткаў і высылка ў Сібір – такі лёс напаткаў многіх у тагачаснай Беларусі. Фотаздымак з надпісам на дошцы з капліцы можа праліць святло і на стаўленне да асобы Т. Рэйтана ў той час, калі ён быў яшчэ жывы.

*Мураванка, 1930 г.*

Добра вядома, што многія і па сённяшні дзень лічаць, што Тадэвуш памёр у стане цяжкага псіхічнага захворвання. Але пры гэтым не прыводзіцца ніякіх доказаў, напрыклад, спасылак на медыцынскія дакументы, якія засталіся пасля яго смерці. Таму паўстае пытанне: ці не магло тут быць спробы такога ж захаду, так бы мовіць, дыстанцыравацца ад асобы Т. Рэйтана, як і ў гісторыі з пахаваннем? З успамінаў пра Рэйтана (Сапліца) нам добра вядома, што Тадэвуш меў асаблівы, вельмі цвёрды, характар і ніколі не адступаў ад сваіх прынцыпаў. У апошнія дні жыцця ён часцяком звяртаўся да гасцей, якія наведвалі Грушаўку, з заўвагай аб тым, што не той зараз час, каб наладжваць баляванні. Маўляў, Бацькаўшчыну разрываюць на часткі, і іх месца не за сталом, а там, дзе патрэба ёсць у змаганні за лёс краіны. Маглі пайсці чуткі аб такіх размовах. А гэта было вельмі небяспечна. Але калі выставіць чалавека вар'ятам, то што ж з яго ўзяць? Няма ніякай адказнасці за яго размовы. Усё гэта звязвае ў адно цэлае патаемнае пахаванне, надпіс на ўшанавальнай дошцы з капліцы і чуткі аб псіхічным захворванні Т. Рэйтана. Тады атрымліваецца, што яго смерць – не ўчынак вар'ята, а ахвяра Айчыне, лагічны вынік барацьбы і трагічнага жыцця. І стаўленне да гэтага чалавека павінна быць іншым.

У ляхавіцкім касцёле Святога Юзафа ўсталяваная дошка з выяваю Тадэвуша Рэйтана. Пад час памінальнай імшы ксёнз Станіслаў Маленькі выказаў, на мой погляд, вельмі важную думку аб тым, што Каталіцкая Царква паступова мяняе свой погляд на самагубцаў, бо іншым разам чалавек можа апынуцца ў такіх абставінах, з якіх для яго сапраўды няма іншага выйсця. І не людзям аб гэтым судзіць.

Але не ўсе згодныя з такой думкаю. Напрыклад, у Ляхавічах, дзе на сродкі сям'і Рэйтанаў былі пабудаваныя касцёл Святога Юзафа (сёння паліклініка), будынак мясцовага банка (сёння школа мастацтваў), існавала школа імя Т. Рэйтана (сёння вучэбна-вытворчы камбінат), намерыліся назваць адну з вуліцаў імем Тадэвуша Рэйтана. Нават правялі апытанне сярод жыхароў. Большасць людзей падтрымала гэтую ідэю. Але ж такая вуліца так і не з'явілася на карце горада. І ўсё з той прычыны, што, маўляў, нельга ўвекавечваць памяць самазабойцы. Можа, пасля гэтага артыкула тыя людзі, ад якіх залежала станоўчае вырашэнне гэтага пытання, зменяць сваю пазіцыю? Будзем чакаць і спадзявацца на лепшае.

***Вось такія думкі нарадзіліся пад час знаёмства з фотаздымкамі Яна Булгака, дзе адлюстраваная Грушаўская сядзіба.***

*Марына ЖАБІК,*
*г. Ляхавічы*




*Капліца ў Грушаўцы і барэльеф з выяваю Т. Рэйтана*

# Час збіраць камяні памяці

## Спадчына графскага роду Забэлаў на Бабруйшчыне

*(Заканчэнне. Пачатак у № 42)*



### Капліцу-пахавальню Забэлаў — пад ахову дзяржавы!

Дзякуючы ці то шчасліваму выпадку (і густому хмызняку, што хаваў ад людскіх вачэй), ці то сапраўды абароне лёсам месца, дзе знайшлі вечны спачын прадстаўнікі Забэлаў, што жылі на Бабруйшчыне, але і сёння на старых могілках у вёсцы Ізюмава стаіць незвычайная капліца – радавы склеп графскага роду. Могілкі знаходзяцца амаль каля самой дарогі, што вядзе на саўгас імя Леніна, але яшчэ да нядаўняга часу капліцу нельга было разгледзець у зарасніках кустоў і высокіх дрэваў.

Капліца была ўзведзеная на старых Дурыніцкіх могілках прыблізна ў 1900–1907 гг. над сямейным склепам Забэлаў. Пабудаваная з абчасанага каменю, спалучэнне шэрага і ружовага колераў якога надаюць ёй асаблівую маляўнічасць. Будынак прамавугольны ў плане, пад двухсхільным дахам, мае архітэктурныя рысы мадэрну. У бакавых сценах – па адным спічастым акне. Такую ж спічастую форму мае ўваходная брама. Над уваходам і над алтарнай часткай маюцца круглыя люкарны. Вокны, люкарны і праём ўваходнай брамы аздобленыя чырвонай цэглай, якая, згодна з адбіткам «Бр. Г. і Е. Лазінскія», была выраблена на цагельні братоў Лазінскіх, што дзейнічала ў Бабруйску з 1895 г.

Падлога выкладзеная чорна-белай кафляю. Як бачна па люстэркавым адбітку кляйма «Marywil» на адваротным боку пліткі, яна выраблена на заводзе падлогавай пліткі і вогнетрывалых вырабаў «Марывіль», які быў заснаваны ў 1896 г. у Радаме (Польшча). У канцы XIX–пачатку XX стст. плітка гэтага завода лічылася адной з лепшых.

*Надмагільная пліта Соф'і Рудзееўскай-Забэлы*

У падлогу ўмураваныя надмагільныя пліты з чорнага граніту. На плітах можна прачытаць імёны тых, хто спачывае пад імі: граф Антоні Забэла (1785–1861), жонка графа Антоні Тэкля Панцэвіч (1802–1862), дачка Антоні і Тэклі Барбара Збарамірская, жонка графа Шымана Эразма Забэлы Соф'я Рудзееўская (1842–1867), дачка Шымана Эразма Забэлы і Соф'і Рудзееўскай Станіслава (1865–1895).

Ксёндз Язафат Жыскар у 1913 г. так апісваў унутранае ўбранне капліцы ў сваім даведніку «Нашы касцёлы»: «*..алтар, падсвечнікі, канфесіянал і ўсё ўнутранае афармленне выкананае з чорнага дубу, што надае капліцы паважны і жалобны выгляд*». У капліцы быў нават арган, прывезены графам Забэлам з Прагі. Сёння нічога з унутранай аздобы капліцы не захавалася. На сценах унутры цалкам знішчаная тынкоўка.

*Так цяпер выглядае інтэр'ер капліцы*

Капліца нясе на сабе сляды ваяўнічага атэізму мінулага стагоддзя і, на жаль, нашай абыякавасці да памяці продкаў. Яшчэ да нядаўняга часу капліца была закінутая і не патрэбная нікому, акрамя шукальнікаў скарбаў, гатовых за імі лезці нават у магілы. Не маючы нават уяўлення пра пашану да памерлых, яны прабілі падлогу, каб патрапіць у склеп. У выніку некаторыя надмагільныя пліты амаль праваліліся, дзве пліты адколатыя. У прабоінах бачныя цагляныя скляпенні.

Канец XX – пачатак XXI стст. сталі часам збірання параскіданых за гады панавання бязбожжа камянёў памяці, спадчыны. На шчасце, знайшліся людзі, неабыякавыя да лёсу капліцы Забэлаў. У 2007 г. з ініцыятывы ксяндза-пробашча Бабруйскай рыма-каталіцкай парафіі Беззаганнага Зачацця Найсвяцейшай Дзевы Марыі Юрыя Быкава ў вёсцы Ізюмава быў арганізаваны летнік, пад час якога маладыя парафіяне бабруйскага касцёла прыбралі смецце і навялі парадак у капліцы і на тэрыторыі могілак. Таксама сіламі Бабруйскай парафіі ўваход быў зачынены жалезнай брамай, над капліцай быў усталяваны дах, а на даху ўзнесены крыж як знак таго, што гэта – святыня.

Унутры капліцы стаіць драўляны крыж, абраз Езуса Міласэрнага і свечка, якая запальваецца кожны год на Дзяды, 2 лістапада, калі ў капліцы праводзіцца імша.

Капліца ўяўляе сабой як гістарычны помнік (як пахавальны склеп роду Забэлаў), так і помнік сакральнай архітэктуры. Для нашых мясцінаў яе можна лічыць унікальнай (такіх капліцаў з бутавага каменю не так шмат у Беларусі). Яе аднаўленне цалкам магчымае, і, як здаецца, нават не паўстане пытання аб тым, ці трэба гэта рабіць. Капліцу неабходна ўзяць пад ахову дзяржавы і адрэстаўраваць. Хочацца спадзявацца, што сур'ёзная ўвага на яе будзе звернутая як мага хутчэй. Бо той стан, які мае капліца сёння, пакідае адчуванне крыўды за нас, беларусаў, за нашае стаўленне як да спадчыны, так і да святога месца – месца пахавання нашых продкаў, няхай нам і не вядомых, але тых, што жылі на беларускай зямлі. Нягледзячы на ўсе захады бабруйскіх парафіянаў жалезныя краты на адным з вокнаў былі ўзарваныя, і апаганьваннне капліцы працягваецца. Найбольш жудаснае ўражанне складваецца ад чалавечых костак, якія ляжаць каля адной з адколатых плітаў.

Ва ўладанні кашталянскай лініі Забэлаў былі такія маёнткі, як Чырвоны Двор, Паазер'е, Апіталокі, якія знаходзяцца зараз на тэрыторыі Літоўскай Рэспублікі. На беларускай зямлі, акрамя капліцы ў Ізюмава, захаваўся маёнтак у вёсцы Арэхаўна Ушацкага раёна. Захаванасць літоўскай спадчыны Забэлаў стварае моцны кантраст з нашай. На дарогах краіны-суседкі стаяць указальнікі, якія інфармуюць пра тое, што побач можна ўбачыць спадчыну роду Забэлаў. А ці ведае хто-небудзь, што за каплічка знаходзіцца ў вёсцы Ізюмава Бабруйскага раёна? Ні на каплічцы, ні побач з ёю няма ніякага пазначэння, калі яна была пабудаваная, і каму належала. Няма сумненняў у тым, што каплічка была б цікавым турыстычным аб'ектам.

***Марына МАЎЧАНАВА,***
***малодшы навуковы супрацоўнік Бабруйскага раённага гісторыка-краязнаўчага музея***
***Фота аўтара***

# Запаліць агонь цікавасці

У пачатку лістапада на гістарычным факультэце Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя П.М. Машэрава адбылася сустрэча студэнтаў з выдатным краязнаўцам, настаўнікам СШ № 3 г. Мёры Вітольдам Антонавічам Ермалёнкам. Гэты чалавек, без перабольшання, легендарная асоба ў краязнаўстве Віцебшчыны і ўсёй Беларусі. Вітольд Антонавіч – лаўрэат прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «За духоўнае адраджэнне» (1999), Чалавек года Віцебшчыны (2009).

Сустрэча, арганізаваная клубам «Краязнавец», была прысвечаная тэме «Краязнаўства – аснова патрыятызму». Пад час яе Вітольд Антонавіч займальна распавёў пра свой шлях да краязнаўства і досвед краязнаўчай дзейнасці. Ураджэнец в. Жэймяны, што на Браслаўшчыне, В. Ермалёнак зацікавіўся гісторыяй дзякуючы расповедам бацькі пра лёс прадстаўнікоў роду і мінуўшчыну краю. А свае першыя «раскопкі» правёў у шасцігадовым узросце: уражаны расказам старэйшай сястры, якая даведалася пра археалогію ў школе, шукаў на вясковай дарозе скарб.

Пасля заканчэння гістфака Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта ў 1976 годзе Вітольд Антонавіч прыехаў працаваць у Мёры. Тут заснаваў гурток «Арганаўты мінулага», у якім пад кіраўніцтвам настаўніка вучні і сёння далучаюцца да вывучэння роднага краю. Сам шчыра захоплены даўніною, педагог валодае талентам запаліць агонь зацікаўленасці ў душах школьнікаў. Дэвіз гурткоўцаў – «Шукаць і знаходзіць! Знайсці і захаваць!» Разам з вучнямі Вітольд Антонавіч здзяйсняе археалагічныя разведкі, запісвае ўспаміны старажылаў, распрацоўвае турыстычныя маршруты па Мёршчыне, выдае газету «Мёрская даўніна», збірае каштоўнасці для створаных ім у школе ўнікальных музеяў – Музея гісторыі краю і Музея кнігі і друку.

Вялікую зацікаўленасць выклікаў і аповед пра знаходкі «арганаўтаў», якімі папаўняюцца музейныя фонды. Некаторыя прадметы сапраўды ўнікальныя, напрыклад, фальшывая арабская манета – дырхем X стагоддзя, аналагаў якому няма нават у Эрмітажы. Або каменная прылада працы, знаходка якой дае падставу сцвярджаць, што першыя людзі з'явіліся на Віцебшчыне яшчэ напрыканцы палеаліту.

Вітольд Антонавіч лічыць, што аснова патрыятызму – у веданні таго багацця культуры, традыцыяў і звычаяў, якія жывілі наш народ, не далі яму загінуць у самыя цяжкія часіны. І з гэтым нельга не пагадзіцца.

***Анатоль ДУЛАЎ, Дзяніс ЮРЧАК,***
***г. Віцебск***

# Паеду зноўку ў пасёлак...

За вакном аўтобуса – буяе верасень... Дзе-нідзе пажоўклі верхавіны дрэваў, згубіўшы свой зялёны ўбор. Палеткі таксама сцішэлыя, парыжэлыя, зелянеюць толькі азімыя. Ды кукуруза ціха шапоча каля дарогі, ды пырхаюць птушыныя чародкі. І чаму затрымаліся тут, не адляцелі ў далёкі край? Пэўна, вабіла апошняе восеньскае цяпло. А вось расстанне з роднымі мясцінамі, верагодна, заўсёды балючае для ўсяго жывога на свеце!

Я даўно лічуся гараджанкай, але родныя мясціны клічуць да сябе... Рэгулярна ў снах бачу свой пасёлак, якога ўжо няма на карце Добрушскага краю. І робіцца тады горка і балюча на сэрцы. Сумуюць таксама і мае землякі, з якімі разам прайшло басаногае дзяцінства. Шкада, былое не вяртаецца. А толькі чалавечая памяць захавала ў сваёй скарбонцы ўсё самае цёплае і роднае...

Чырвоны Рог Васільеўскага сельсавета – невялічкі пасёлак, меў больш за сорак хацінаў. Зялёны і ўтульны куточак улетку патанаў у засені дрэваў, радавалі вочы і кветкі, розныя зёлкі ў лузе. Жылі тут дружныя і працавітыя людзі. Рослыя, прыгожыя. Нездарма ж калісьці да мясцовых дзяўчатаў прыязджалі ў сваты хлопцы з усіх навакольных вёсак!

Ніхто цяпер не ведае дакладную дату нараджэння маёй вёсачкі, значыць, няма і адпаведных фактаў, бо старажылы ўжо адляцелі ў той вырай, з якога ніхто яшчэ не вяртаўся... Ведаю, што ў дваццатых гадах мінулага стагоддзя, Рог утварылі не надта багатыя насельнікі вёскі Перарост. Верагодна, маладыя людзі спадзяваліся на лепшую долю, больш заможнае жыццё, чым у цеснай бацькоўскай хаце. І назву прыдумалі цікавую – РОГ. І сапраўды: балота там напамінала рог каровы, які клінам цягнуўся да суседскага пасёлка Камень. Потым, за савецім часам, сталі называць Чырвоным Рогам. Аналагічны лёс напаткаў і Арол, і Алёс, і той жа Камень. Усе яны таксама раптам «пачырванелі»!

Як успамінаюць суседкі-бабулькі, у той час у нашым пасёлку было шмат моладзі. Таму вясковыя хаты гудзелі, бы вулей, дзіцячымі галасамі. Да Вялікай Айчыннай вайны дзейнічала нават пачатковая школка. Была і так званая дамалаўка – крама, дзе можна было набыць запалкі, цукар, рыбу, цукеркі і нават пляшку гарэлкі... Але, калі шчыра казаць, пьяніцаў не было. Мае вяскоўцы добра ведалі, дзе і як трэба выпіваць!

Калі дзед Карнюшка пастарэў і адмовіўся выконваць абавязкі прадаўца і загадчыка дамалаўкі, замены не знайшлося. Пэўна, ніхто не пажадаў тады ўзваліць на свае плечы адказную працу. А можа, гэта быў першы крок да неперспектыўнасці населенага пункта?

Вялікая Айчынная вайна знішчыла многія вёскі на Гомельшчыне, у тым ліку і Чырвоны Рог. Ацалелі тады толькі дзве-тры хаты. Калі фашысты адступалі на Захад, яны нікога не шкадавалі. Людзі хаваліся ў акопах ў канцы сваіх агародаў. Пад час вызвалення нашай вёсачкі загінулі 10 салдатаў, сярод якіх значыцца і лейтэнант... Пахавалі тады воінаў у цэнтры вуліцы, на самым відным месцы. Помнік-магілу даглядалі і мы, вясковая дзятва, і піянеры з сельскай школы. Пазней, калі апусцеў пасёлак, астанкі загінулых перанеслі ў суседнюю вёску Васільеўку. На месцы былога помніка мае землякі ўстанавілі крыж з шыльдай, дзе пералічаныя імёны ўсіх загінулых. Шкада, святое месца паступова зарастае быллём. А гэта ж, калі шчыра, не палюдску! Уладзімір Аляксеевіч Алампіеў, мой зямляк, імкнецца навесці нейкі парадак. Але ж і ён жыве-працуе ў Гомелі. Гэты добразычлівы, шчыры чалавек мае за плячыма добры абярэмак гадоў, і усё спадзяецца, што нехта з мясцовых энтузіястаў дапаможа яму...

З вогненных франтавых дарог амаль у кожную хату хтосьці не вярнуўся. Не дачакаліся сыноў бацькі і матулі, каханыя жонкі і нявесты. Маладых, дужых, прыгожых. Асобныя нават не паспелі звіць сямейнае гняздзечка, нарадзіць дзетак.

Да прыкладу, бабулька Авіліха, нашая суседка, так і не дачакалася з вайны двух сыноў. Да апошніх дзён жыцця спадзявалася, што хоць хто вернецца дахаты, бо ў пахаронцы значылася, што адзін з яе хлопцаў прапаў без вестак, але дарэмна. Так і пайшла з жыцця з гэтаю надзеяй! Боль маці не ўзважыць ні на якіх вагах...

Нялёгкая доля выпала тады салдацкім удовам, падлеткам... Моцных мужчынскіх рук не хапала. Вось і выконвалі дзяўчаткі і жанчынкі цяжкую сялянскую працу.

Вайна яшчэ грымела дзесьці каля Брэста, а вяскоўцы ўжо ладзілі калгас, каб дапамагаць фронту, каб карміць разбураны горад і сябе... Спачатку кіраваў калгасам Вавіла Маставенка, а потым – Кузьма Ярмоленка, бо яны вызначаліся пісьменнасцю, жыццёвай мудрасцю, кемлівасцю.

Ужо ўлетку гаспадарцы выдзелілі пяць каровак, шэсць авечак, якіх старанна даглядалі Анастасія Таўкачова і Таццяна Ярмоленка. Праз некаторы час рахункаводу ўдалося дзесьці здабыць адно парася. Іван Жгунцоў строга тады папярэдзіў, каб маладзіцы даглядалі яго нібыта тое дзіця. І глядзелі, і трымцелі над гэтай свінкай, як над самым дарагім чалавекам, бо ведалі, што ад гэтага залежыць з'яўленне свінафермы.

Як першага веснавога промня, чакалі вяртання франтавікоў у родныя мясціны. Але вярнулася не надта шмат... Вось, да прыкладу, Павел Макееў прыехаў дахаты інвалідам, без нагі... Які з яго памочнік у працы? Асобныя – хворыя на сухоты, якія сабе прыдбалі ў халодных акопах ды на крывавых дарогах вайны. Таму і пражылі нядоўга... Каму пашанцавала выжыць, адразу браліся за любую справу ў калгасе. Разумелі: умелыя мужчынскія рукі цяпер на вагу золата.

Макар Ананчанка, Лука Галаганаў, Емяльян Галаганаў разам з салдацкімі ўдовамі Фядорай Шкіра, Еўдакіяй Дзергачовай, Еўдакіяй Панамарэнка рыхтавалі з гліны і саломы будматэрыял. Пасля добрай усушкі такіх цаглінаў узвялі тры будынкі для калгаснай жывёлы. Востра не хапала рабочых рук, таму што даяркі і свінаркі шчыравалі яшчэ на калгасным полі. Тэхніка адсутнічала, пра яе толькі марылі, а нормы выпрацоўкі былі тады высокія: адзін гектар лёну і жыта на чалавека. Зразумела, жыта жалі звычайным сярпом, сем'ямі працавалі на палетках, дзе рос лён...

Дзіўна толькі адно: на якім патрыятызме і энтузіязме ўсё рабілася? З якой крыніцы бралі цярплівасць і працавітасць, веру ў лепшае жыццё? Жылі ж у зямлянках, напаўгалодныя, не было шыкоўных убораў. Не было і выхадных, водпускаў. Дзіцячыя яслі-садкі адсутнічалі, выхаваннем дзетак займаліся бабулі і дзядулі. Многія ўдовы сваіх дзяцей бралі ў поле, якіх «выхоўвалі» прырода ды спевы птушак. І працавалі ў полі за голую «палачку» ў табелі: на кожны працадзень выдзялялі па 200 грамаў зерня.

Толькі ў 1947 годзе пасёлак пачаў паціху будавацца на старых папялішчах. А ў 1950-м пачалося аб'яднанне дробных гаспадарак з больш вялікімі. Чырвоны Рог тады далучылі да калгаса імя Варашылава (пазней калгас называўся імя Ю. Гагарына). Вясковы люд абсталёўваў сваё жыццё. Як і да вайны, нараджалі дзетак, жылі весела і дружна. Пасля працы ў полі вярталіся дахаты з песнямі, якія было далёка чуваць. А як весела святкавалі дажынкі і дакопкі! Менавіта згуртаванасць, сяброўская падтрымка, працавітасць дапамаглі маім землякам перажыць пасляваеннае ліхалецце, выстаяць і не апусціць крылы надзеі. Аднак моладзь не пажадала жыць у неперспектыўным пасёлку, дзе не было нават крамы... Закончыўшы школу, усе падаліся ў горад на вучобу альбо працу.

...Пасля Чарнобыльскай аварыі ў пасёлку засталіся толькі дзве сям'і: дзед Якім Хмялёў і Варвара Галаганава са сваёй старэнькай мамай. У 1987 годзе цётка купіла хату ў суседняй вёсцы, ды без асаблівага жадання пераехала туды з матуляй. А вось дзед упарта працягваў жыць у горкай адзіноце... Пажыўшы некаторы час у сына, зноўку вярнуўся ў родную хату. Не прывабіў старога горад сваімі ўтульнымі вуглямі. Вось так і памёр у адзіноце...

*Ганна АТРОШЧАНКА,*
*Добрушскі раён*

# Ліст смутку

Вядомы рускі паэт XIX стагоддзя Апалон Мікалаевіч Майкоў (1821–1898) пакінуў вялікую эпісталярную спадчыну, якая захоўваецца ў Інстытуце Рускай літаратуры (Пушкінскі Дом). Маю ўвагу прыцягнуў адзін ліст, адпраўлены паэтам 27 студзеня 1879 года прафесару Дэрпцкага ўніверсітэта П.А. Віскаватаву. Падставай для яго напісання стала паведамленне Паўла Аляксандравіча Віскаватава пра хуткую смерць сябра і таварыша Апалона Майкова, а таксама яго калегі па ўніверсітэце, дацэнта кафедры рускай мовы і літаратуры М.В. Прахава.

Мсціслаў Віктаравіч Прахаў (1840–1879) – наш суайчыннік, навукоўца, паэт і перакладчык – нарадзіўся ў Мсціслаўі Магілёўскай губерні. У сувязі з тым, што пра гэтага чалавека з-за яго непрацяглага жыцця захавалася вельмі мала біяграфічных звестак, ліст паэта Апалона Майкова ў нейкай ступені запаўняе гэты прабел і дапамагае нам даведацца пра нашага земляка нешта новае. Таму прыводжу ліст Апалона Мікалаевіча цалкам.

«*К событию, о котором Вы мне сообщаете,* — піша паэт, – *я уже давно был готов. Но совершившееся, тем не менее, поразило меня. Самого умного в той сфере, к которой мы с Вами принадлежим, в понимании искусства, истории, филологии – не стало. А кто это чувствовал, сознавал и ценил? Не приходилось ли нам (мне, по крайней мере, постоянно) всегда защищать или объяснять его почти перед всеми профессорами, учёными, патентованными, признанными, господствующими и увенчанными – и вас слушали со снисходительной улыбкой! Не по их шаблону образовался этот человек! А отчего? Этого они никогда не поймут, ибо, он же говорил, их учёность – знание и изучение переплётов! Всё для их важное давно им было проглочено и уже извергнуто, оставив только то, что питает, — идея, внутренний смысл, правда жизни, следовательно, синтез всего – поэзия! Филология у него разрешалась в поэзию, в творческое воссоздание. Годы моей близости с ним были для меня новой школой, новым университетом. Никто в моей жизни мне столько не дал, как он. Мстиша, Мстиша!* (Так называў Майкоў свайго блізкага сябра Мсціслава Прахава. – **В.А.**). *Смотри на эти строчки, обливаемые слезами, и да будут они тебе – твоя от твоих!..*

*Ах, сколько жгучих вопросов возбуждается – этих отчего? да почему? Почему оставил он след только в нескольких людях, в немногих, — Вы, да я, да может быть, дерптские слушатели? Отчего он не проявил своих сил на всю нашу науку, на общество? Отчего он не мог писать? Отчего он писал, было – не то, не так сильно и выразительно, ясно и просто, как говорил? Этого я до сих пор не понимаю. А болен-то уж он был давно: не от болезни ли это?*

*Но от него остались груды бумаг. Никому, как Вам, их не разобрать, и, может быть, извлечь оттуда перлы его мысли. И это, право, было важнее Ваших занятий Лермонтовым. Лермонтов – явление законченное, ясное и определённое. Откройте Мстишу. Это будет новое. Работа благодарная. Я об этом буду говорить в семействе. Из семейства разве Муня могла бы Вам помочь. Она едва ли не одна его понимала вполне. Мать – инстинктом.*

*Меня перерывают. Спешу отослать Вам эти строки.*

*Мстиша давно уже для нас ушёл. Умри он внезапно – в блеске своих сил, перед отправлением, например, в Дерпт, – какой бы удар был? Понемногу – я, по крайней мере, – привыкал не иметь его подле себя – была, правда, надежда – но вот и она оборвалась.*

*С покойником невольно сводишь счёты. Я уже сказал, что мне никто столько не дал, как он. Но что мы ему дали?*

*А как он понимал христианство, высокую нравственность христианства! Какую чудную поэму слагал по Евангелии – и в особенности Луки. В его бумагах есть книга in folio, где он таил (?) разные черняки, и, между прочим, для своей невесты (помните?) – там есть страницы об этом. Он мне читал. Прелесть. Вам надо разобрать его писания, непременно.*

*До свидания!*

*А. Майков*

*Янв<аря> 27 1879*

*Он был – величайший поэт в пониманьи! Чего-то недостовало до творчества – но чего же, чего? А в понимании он превосходил всех нас!»*

«Гады маіх стасункаў з Прахавым былі для мяне новай школай, новым універсітэтам»

«Не паводле шаблону патэнтованых прафесараў сфарміраваўся гэты чалавек. Яны гэтага ніколі не спасцігнуць, бо іх вучонасць – веданне і вывучэнне пераплётаў»



*П. Віскаватаў*

Каб лепей зразумець сэнс гэтага цудоўнага ліста, спынімся на некаторых біяграфічных эпізодах яго аўтара. Апалон Майкоў паходзіў са старажытнай дваранскай сям'і культурных дзеячаў Расіі. Яго бацька акадэмік жывапісу і гаспадар буйнога ў Пецярбургу мастацкага салона, які наведвалі амаль усе расійскія пісьменнікі, мастакі і дзеячы культуры.

З дзіцячых гадоў Апалон выхоўваўся ў атмасферы, насычанай мастацтвам, размовамі пра жывапіс і літаратуру. Адным з яго настаўнікаў быў І.А. Ганчароў – будучы знакаміты рускі пісьменнік, сяброўства з якім доўжылася больш за паўстагоддзе.



*А. Майкоў*

Пісаць вершы А. Майкоў пачаў з 13-гадовага ўзросту. У часопісе «Библиотека для чтения» за 1835 год побач з «Песнями Западных Славян» А.С. Пушкіна за поўным подпісам быў апублікаваны яго верш «Орёл».

Першая кніга «Стихотворения Апполона Майкова» выйшла ў свет у 1842 годзе. В.Г. Бялінскі, які прысвяціў зборніку грунтоўную рэцэнзію, выказаў меркаванне, што анталагічныя вершы Майкова «едва ли не превосходят» пушкінскія, а верш яго падобны на верш «первых мастеров русской поэзии».

У сярэдзіне 1840-х гадоў Апалон Майкоў знаёміцца з Бялінскім, Тургеневым, Някрасавым, Панаевым, Грыгаровічам, Краеўскім, з петрашэўцамі, у тым ліку Пляшчэевым, Дастаеўскім, сяброўства з якім усталявалася на ўсё жыццё. У гурткі Бялінскага і петрашэўцаў Майкоў, паводле яго словаў, «ходил в гости». Па справе петрашэўцаў Апалон Мікалаевіч на кароткі час быў арыштаваны, але ніякага ўплыву на яго лёс і творчасць гэты эпізод не меў, хаця знаходзіўся пад таемным наглядам да 1855 года.

*Дэрпцкі ўніверсітэт, 1890 г. (літаграфія Шлацера)*

У красавіку 1888 года рускае грамадства адсвяткавала 50-гадовы творчы юбілей Апалона Мікалаевіча. У гэтыя дні Майкоў успрымаўся як «чистый лирик», пераемнік Пушкіна і Лермантава. Пры жыцці ён выпусціў у свет 6 шматтомных поўных збораў сваіх твораў.

Апалон Мікалаевіч быў на 19 гадоў старэйшы за Мсціслава Прахава, які быў варты яму ў настаўнікі. І гэты цудоўна адукаваны і ўсебакова развіты чалавек, не саромячыся, прызнаецца такому ж маладому, як і М. Прахаў, Паўлу Віскаватаву, што «*годы моей близости с ним (М. Прахавым) были для меня новой школой, новым университетом. Никто в моей жизни мне столько не дал, как он*». Якім жа розумам валодаў наш суайчыннік, беларус Мікалай Віктаравіч Прахаў, якія веды меў, што заслужыў такое прызнанне ад свайго старэйшага сябра?

1854 ГОДЪ.

СТИХОТВОРЕНІЯ

А. П. МАЙКОВА.

САНКТПЕТЕРБУРГЪ.

Нам не вядома, ці разабраў П.А. Віскаватаў стосы папераў, пра якія пісаў яму Апалон Майкоў, каб дастаць адтуль «перлы его мысли». Хутчэй за ўсё, не, бо хутка пасля гэтага Павел Аляксандравіч стаў першым упаўнаважаным Славянскага камітэта і ўпаўнаважаным Чырвонага крыжа на Дунаі. Чытаў курсы па рускай літаратуры, гісторыі славянскіх літаратураў, гісторыі літаратуры Балгарыі, сербскай літаратуры і славянскіх старажытнасцяў. А на ўсё гэта трэба было шмат часу.

***Задача беларускіх даследчыкаў – адшукаць тыя паперы Мсціслава Прахава і выявіць у іх «перлы его мысли», зрабіўшы набыткам усіх зацікаўленых.***

***Вячаслаў АФАНАСЬЕЎ***

# «Птушкі радасці» Аляксандра Зайкі

***Ціхі свежы ранак. Прачынаецца вёска. І тут і там цягнецца з комінаў, шукае дарогу да неба лёгкі дым. Спрадвечная вясковая малітва жыццю, урачысты гімн яму – дым з коміна.***

Кожны год важкі на нейкія падзеі. І для нашага Івацэвіцкага краю гэты год не стаў выключэннем. Сёлета ў канцы верасня жыхары раёна змаглі пазнаёміцца з першай «ластаўкай» – «Дым з коміна», якая была выпушчаная з-пад пяра мясцовага краязнаўцы Аляксандра Фаміча Зайкі.




«Дым з коміна» адлюстроўвае ўбачанае і пачутае за час шматлікіх падарожжаў Аляксандра Зайкі. Свае ўражанні збіральнік фальклору і народнай лексікі перадае праз лірычныя запісы, мініяцюры і апавяданні. Яны – своеасаблівы працяг краязнаўчага досведу аўтара, увасобленага ў літаратурныя формы. І хоць яны напісаныя ў розныя гады, іх яднае неаслабная ўвага да чалавека, роздум пра час, радасць і неспакой за кожны пражыты дзень. Творца адкрывае адметнасці менталітэту беларускага этнасу, адзначае іх захаванасць, развіццё, зменлівасць у гісторыі і часе. Жывая народная мова, назіральнасць, тонкі лірызм якраз і вызначаюць творчую манеру аўтара.

Але ж як цудоўна, што «другую ластаўку» не спатрэбілася доўга чакаць. У гэтым жа годзе ўбачыла свет яшчэ адна кніга А. Зайкі – «Дыялектны слоўнік Косаўшчыны». Гэтае ўнікальнае выданне – шматгадовая карпатлівая праца. Трэба нагадаць, што Косаўшчына – любімая тэма краязнаўства ў творчасці Аляксандра Зайкі.

Аляксандр Фаміч падзяліўся планамі на наступны год: выдаць тры кнігі. Пажадаем поспехаў нашаму земляку ў творчай дзейнасці. Хай «птушкі пяра» прыносяць толькі радасць і светлыя думкі на далейшы жыццёвы шлях.

***Вольга АГЕЙЧЫК***

## «Радасць»

### *(з кнігі А. Зайкі «Дым з коміна»)*

Расчуленая, радасная, немаладая ўжо настаўніца хваліцца, што яе сёння падвёз да школы былы вучань на ўласнай машыне.

– Гэта ж пазнаў, проста пасярод дарогі вось так і спыніўся, – усё расказвае яна. – Неслух быў, і ў куток ставіла, і двойкі. А тут…

І толькі ўбачыўшы іранічныя насмешкі сваіх маладзейшых калег, супакоілася, ціха сказала:

– І праўда, папала сляпой курыцы зерне…

Празвінеў званок. Настаўнікі заварушыліся, заспяшаліся разысціся па класах. І твары ва ўсіх былі ці не занадта сур'ёзныя.

## Адказы на крыжаванку, змешчаную ў № 42

***Уздоўж*: 3**. Ранне. **4**. Гай. **6**. Багач. **11**. Лістапад. **12**. Асамблея. **13**. Ураджай. **16**. Краса. **17**. Ерась. **18**. Чаркі. **20**. Капец. **23**. Нядзеля. **27**. Жытнішча. **28**. Сачавіца. **29**. Піліп. **30**. Дар. **31**. Вецце.

***Упоперак*: 1**. Кастрыца. **2**. Каўбаска. **5**. Атрад. **7**. Лісток. **8**. Здор. **9**. Вада. **10**. Межань. **14**. Дамавік. **15**. Лецейка. **18**. Часнык. **19**. Рабіннік. **21**. Палавіца. **22**. Царыца. **24**. Якар. **25**. Згода. **26**. Ліст.

*Фота Алеся САЧАНКІ*

# Малая краязнаўчая энцыклапедыя

*(Пачатак у № 1 за 2003 год)*

**ЛЯ́МЕЦ** – валены матэрыял з воўны. Выкарыстоўваўся са старажытных часоў для вырабу конскай збруі (хамутоў, падсядзёлкаў, потнікаў, запонаў), галаўных убораў (шапак-магерак, капелюшоў). З XIX ст. – і абутку (валёнак). Для вырабу лямцу замочаную ў гарачай вадзе воўну некалькі разоў камячылі рукамі або нагамі, раскочвалі драўлянымі і жалезнымі

*Лямцавы брыль*

качалкамі, пасля сушкі расчэсвалі жалезнай шчоткай. У наш час рымарскі і тэхнічны лямец вырабляюць на спецыялізаваным прадпрыемстве валюшна-лямцавых вырабаў.

**ЛЯМЕ́ШКА** – рэдкаватая страва з мукі. Жытнюю муку (у Ельскім, Лельчыцкім, Мазырскім р-нах – грэцкую) падпражвалі, потым засыпалі ў круты вар або залівалі ім, варылі ў печы пры агні. Кажуць: «З аднаго мешка хлеб і лямешка», «За лыжкаю лямешкі трэба ісці сто кілометраў пешкі». У наш час лямешкай могуць называць зацірку, рэдкі кулеш, мяшанку жывёле. Вядомая на Брэстчыне, Гомельшчыне, Магілёўшчыне.

**ЛЯ́МУС** (ад ням. Lehmhaus) – старадаўні тып гаспадарчай пабудовы для захавання харчовых прадуктаў, збожжа, адзення, каштоўнай маёмасці, прыладаў працы, а таксама для жылля ўлетку. Быў пашыраны ў Літве, Польшчы, некаторых раёнах Украіны. У Беларусі вядомы ў 2-й палове XVI – 1-й палове XX ст. Будавалі з дрэва, цэглы, каменю або ў тэхніцы «прускага муру». Пад лямусам рабілі пограбы. Былі лямусы 1–3-павярховыя (у ніжнім паверсе гаспадарчыя памяшканні, у верхніх – жылыя), прамавугольныя або квадратныя ў плане, завершаныя 2-схільнымі вальмавымі шатровымі або ламанымі дахамі. Сцены часам звонку і знутры атынкоўвалі.

*Лямус у вёсцы Вялікае Мажэйкава*

Паводле кампазіцыі падзяляліся на цэнтрычныя і франтальныя. Першыя мелі квадратны або прамавугольны план. 2-і і 3-і паверхі былі з балюстраднымі галерэямі па перыметры, якія кансольна навісалі над ніжнім паверхам або абапіраліся на мураваныя ці драўляныя слупы (в. Вялікае Мажэйкава Шчучынскага р-на, Ашмяны, в. Нова-Ясневічы Пастаўскага р-на). Другія былі звычайна 2-павярховыя, мелі ў плане форму выцягнутага прамавугольніка (раздзел квадрата), з галерэямі на галоўным фасадзе (в. Завоссе Баранавіцкага р-на, Гродзенскі лямус) або па перыметры ўсяго будынка. У некаторых замках XVIII ст. (Камянец) лямус размяшчалі над брамамі. У канцы XVIII – XIX стст. пад уплывам стыляў класіцызму і ампіру набылі манументальны выгляд: цэнтр галоўнага фасада вылучаўся прамавугольным парталам з калонамі дарычнага або тасканскага ордэра, ашаляваныя звонку сцены былі ўпрыгожаныя фрызамі, над будынкамі ўзвышаўся бельведэр (в. Дунілавічы і в. Крыкалы Пастаўскага р-на).

*Лямус у вёсцы Нова-Ясневічы (1924 г.)*

**ЛЯНЦЭ́ВІЧ Стась** – беларускі дойлід 1-й паловы XVII ст. Жыў у в. Дойліды (Іўеўскі р-н). Удзельнічаў у будаўніцтве Іўеўскай сядзібы і інш. пабудоваў Іўеўшчыны.

Рэдакцыя «Краязнаўчай газеты» і Беларускі фонд культуры шчыра смуткуюць з прычыны смерці вядомага рупліўца беларушчыны, навукоўца, калекцыянера твораў выяўленчага мастацтва, стваральніка прыватнага музея выяўленчага мастацтва (г. Старыя Дарогі) і культурна-асветніцкага клуба «Спадчына» **Анатоля Яўхімавіча БЕЛАГА** і выказваюць шчырае спачуванне ягоным родным і блізкім.

Газета зарэгістравана ў Міністэрстве інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Рэгістрацыйнае пасведчанне № 384 ад 15 мая 2009 г. Заснавальнікі: грамадскае аб'яднанне «Беларускі фонд культуры», вытворчае прыватнае унітарнае прадпрыемства «Светач», Гілеп Уладзімір Аляксандравіч.

Краязнаўчая газета

Індэкс індывідуальнай падпіскі – 63320
ведамаснай – 633202

Галоўны рэдактар – Уладзімір ГІЛЕП.
Намеснік галоўнага рэдактара Уладзімір Пучынскі.
Рэдкалегія: Анатоль Бутэвіч, Андрэй Вірчак, Анатоль Грыцкевіч, Алесь Карлюкевіч, Лідзія Кулажанка, Адам Мальдзіс, Вячаслаў Рагойша, Віктар Хурсік.

Наш адрас: 220029, г. Мінск, вул. Траецкая набярэжная, 6. Тэл. 283 28 26, 334 61 62. Тэл./факс 334-42-03 E-mail: kraga@tut.by

З-за абмежаванасці сродкаў выданне безганарарнае. Аўтарскія рукапісы не рэцэнзуюцца і не вяртаюцца. Аўтары допісаў у рэдакцыю паведамляюць сваё прозвішча, імя і імя па бацьку, асноўнае месца працы, зваротны адрас. Меркаванні аўтараў могуць не адпавядаць пункту гледжання рэдакцыі. Аўтары нясуць адказнасць за дакладнасць матэрыялаў. Пры перадруку спасылка на «Краязнаўчую газету» абавязковая.

Падпісана да друку: 17.11.2011. Газета надрукавана ў друкарні ТДА «Знамение» (Мінск, вул. Каржанеўскага, 14). Ліцэнзія ЛП № 02330/0150475 ад 25.02.2009.

Заказ 1087. Тыраж 1070 асобнікаў.